ный аспект методологии научного атеизма.» Постановка задачи в общеметодологическом плане привела автора к необходимости решения вопросов, выходящих за рамки исследования. Указанная глава обладает сравнительно меньшей степенью систематизации и целостности изложения материала.

В целом же монографическое исследование отличает четкость методологических позиций и логическая стройность теоретических концепций автора. Книга обладает эвристическим потенциалом в раскрытии нового аспекта философского видения теории и практики научного атеизма.

**Н. И. Миницкий,**
**К. А. Ревяко**

Янка Лучына. **Творы: Вершы, нарысы, пераклады, лісты.** Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. 214 с.

Выхад у свет названай кніжкі — вялікая падзея на ніве нашай нацыянальнай культуры. Вяртаецца Янка Лучына і яго спадчына да чытача. Шлях гэтага вяртання быў цяжкім і складаным. Пры жыцці пісьменнік-дэмакрат убачыў толькі адну сваю кнігу — «З крывавых дзён», якая выйшла ананімна. У ёй пісьменнік расказваў аб рэвалюцыйных падзеях на Міншчыне ў 1863 годзе. Зборнік «Паэзія» выйшаў у Варшаве ў 1898 годзе, калі паэта ўжо не было ў жывых. У 1903 годзе ў Пецярбурзе ўбачыла свет яго «Вязанка». І толькі ў 1953 годзе з'явіліся «Выбраныя творы». Гэта была маленькая, тоненькая кніжачка: усяго 74 старонкі. У ёй былі надрукаваны перш за ўсё паэтычныя творы, напісаныя Я. Лучынам на беларускай мове. Значна менш увайшло ў кнігу перакладаў з польскай мовы. Усяго толькі тры творы: «Абразкі з паляванння» (урывак з паэмы), «На перавозе», «Дзе ты, мая песня?» У новым выданні першы твор надрукаваны цалкам і пад новай назвай «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» у перакладзе Г. Тумаша. Такая назва бліжэй да зместу твора, лепш яго адлюстроўвае. Надрукаваны таксама два творы «Не ради славы иль расчета», «По поводу 100-летней годовщины дня рождения лорда Байрона», напісаныя Я. Лучынам на рускай мове. Чатыры творы («Ямшчык», «Горсць пшаніцы», «Бусел», «Надта салодкія думкі») з'яўляюцца перайманнямі.

Цяперашні аднатомнік выбраных твораў паэта-дэмакрата, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, укладзены У. Мархелем, найбольш поўны. Ён уключае паэтычныя творы на беларускай, польскай і рускай мовах, драматургічны абразок і нарысы, пераклады і перайманні, лісты — усяго 71 твор.

У грунтоўнай і змястоўнай прадмове У. Мархеля раскрываецца творчы і жыццёвы шлях пісьменніка, характарызуюцца яго творы, іх значэнне не толькі для таго часу, але і для сучаснасці. Складальнік прыводзіць таксама шмат цікавых звестак з біяграфіі пісьменніка.

Жыццёвы шлях і дзейнасць Я. Лучыны арганічна зліты з літаратурнай творчасцю, якая непасрэдна адлюстроўвае яго філасофскія, сацыяльныя, грамадска-палітычныя і маральна-эстэтычныя погляды. Светапогляд паэта-пісьменніка вырастае з самой рэчаіснасці, з прыроды і сацыяльнага жыцця, з нацыянальнай і сусветнай культуры. Яго творы вучаць народ, кожнага чалавека цаніць сваю духоўную спадчыну, прыроду і само жыццё чалавека, гуманныя адносіны паміж людзьмі, іх надзеі і спадзяванні, ідэалы.

У «Паляўнічых акварэльках з Палесся» пісьменнік стварае прыгожы малюнак беларускай прыроды, адзначае яе веліч і непаўторную прыгажосць. Жывая прырода няспынна пульсуе сваім харастовом, узбуджае ў чытача пачуцці дабра і прыемнай асалоды. Яна існуе незалежна ад свядомасці пісьменніка. Мастацкімі сродкамі ён толькі глыбока і разнастайна адлюстроўвае яе з'явы, выказваючы свой матэрыялістычны светапогляд.

Вельмі цікава, што пісьменнік разглядае родную прыроду ў сувязі з працоўнай дзейнасцю людзей і ў гістарычным плане. Гэта дазволіла яму выявіць гістарычны шлях развіцця беларускага народа, пачынаючы ад Рурыка нашчадкаў, ахарактарызаваць яго мужнасць у барацьбе з полаўцамі (гл. с. 48).

Гістарычная панарама Палесся не толькі ў старажытным мінулым, а таксама ў сучаснай рэчаіснасці пісьменніка і ў будучыні. «Таму «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся»,— слушна адзначае У. Мархель,— можна паставіць у такі гістарычна перспектыўны рад выдатных твораў, як «Песня пра Зубра» М. Гусоўскага і «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча, якія прадвызначылі з'яўленне «энцыклапедыі беларускага жыцця» — «Новай зямлі» Якуба Коласа» (с. 22).

З выдатнага твора пісьменніка чытач яскрава ўсведамляе логіку развіцця гістарычнага шляху беларускага народа, веліч яго падзей, шчырую і пяшчотную любоў да роднага краю, яго прыроды і культуры. Гістарычнае мінулае ў творчасці пісьменніка арганічна ўзаемадзейнічае з сучасным, ідэйна накіравана ў будучыню. Таму яго лірычны герой надзелены шырокім філасофскім светапоглядам, актыўным імкненнем да пазнання навакольнага свету і жыцця, здольны на подзвігі і рашучыя дзеянні, усведамляе працяглацсь барацьбы з самадзяржаўем. Не выпадкова Я. Лучына піша брашуру пад назвай «З крывавых дзён. Эпізод з паўстання 1863 года на Міншчыне», у якой з вялікай цеплынёй, сімпатыяй і павагай выражае свае адносіны да рэвалюцыйнай барацьбы і паўстан-

ня ў прыватнасці. Ён сцвярджае, што ў барацьбе адраджаўся нацыянальны дух і рэвалюцыйны запал, які ахоплівaў «усе шырэйшыя колы» грамадства (с. 150).

Пісьменнік прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, уважліва сачыў за развіццём грамадска-палітычнай думкі. Так, ужо ў першым нумары «Минского листка» (1886) ён друкуе верш «Не ради славы иль расчета». У ім паэт яскрава адлюстроўвае цяжкае і вельмі гаротнае жыццё беларускага селяніна, які арэ зямлю не плугам, а сахою, есць хлеб з мякінай, жыве ў трухлявай, старэнькай хаціне, крытай саломай, на якой ужо даўно пасцяхова расце зялёны мох. Цемра, забітасць, невуцтва пануюць у сялянскіх вёсках.

Дэмакратычна-асветніцкага напрамку газета «Минский листок» ставіла сваёй мэтай весці рашучую барацьбу супраць такога становішча. Я. Лучына не толькі горача падтрымліваў асветніцкую праграму газеты, але і актыўна змагаўся за яе ажыццяўленне.

Эканамічны і сацыяльны прагрэс пісьменнік не ўяўляў без навуковага прагрэсу. Ён лічыў, што сонца навукі павінна дапамагчы людзям дасягнуць добрай і шчаслівай долі.

У гэтай кароткай рэцэнзіі мы звярнулі ўвагу чытача на ідэйную, сацыяльную і філасофскую накіраванасць творчасці Янкі Лучыны і не закранулі літаратурна-мастацкіх асаблівасцей. Аб апошніх добра і змястоўна сказана ў рэцэнзіі Галіны Тычкі (гл. «Полымя». 1989. № 1. С. 211—214).

Хочацца спадзявацца, што чытач з цікавасцю і натхненнем будзе чытаць творы Янкі Лучыны і знойдзе ў іх многа сугучнага сваёй душы, падзеям сучаснасці.

**А. С. Кляўчэня**

В. Н. Гапеев. **Участники гражданского и арбитражного процесса.** Изд-во Ростовского ун-та, 1988. 124 с.

В советской юридической литературе проблема арбитражных процессуальных отношений исследована недостаточно полно. В частности, в теоретических разработках нуждается институт участников арбитражного процесса, их состав, процессуальные права и обязанности. Используя сравнительно-правовой метод исследования, автор сжато, логично и аргументированно рассматривает правовое положение основных участников гражданского и арбитражного процесса. При этом общие черты сходства в некоторых процессуальных институтах позволили В. Н. Гапееву рассматривать их как виды более широкого родового понятия: правоприменительного процесса.

Представляется удачной структура работы. Она позволила избежать или, по крайней мере, свести к минимуму дублирование материала. По нашему мнению, в работе правильно отмечается, что иск служит средством защиты права не только в суде, но и в арбитраже, в третейском и товарищеском суде, в некоторых других органах, уполномоченных рассматривать споры о праве.

Обстоятельно рассмотрены в монографии вопросы процессуального положения сторон как главных лиц гражданского и арбитражного процесса. Хотя права сторон в сравниваемых процедурах во многом совпадают, справедливо отмечается, что в арбитражном процессе «стороны наделены особым правом участия в принятии решения» (с. 18). Интересен сравнительный анализ обязанностей сторон в гражданском и арбитражном процессе.

Значительное место в работе отведено роли общественных организаций и трудовых коллективов в повышении эффективности судебной и арбитражной юрисдикции. Правоприменительная практика свидетельствует о том, что по многим делам можно было бы избежать серьезных ошибок, если не игнорировать общественное мнение. Определенную теоретическую ценность представляет вывод автора о том, что не только гражданскому судопроизводству свойственна процессуальная форма деятельности. Эта форма деятельности присуща и государственному арбитражу.

Однако изложение некоторых вопросов вызывает замечания или возражения. Так, вряд ли можно согласиться с утверждением, согласно которому в арбитражном процессе нет необходимости вводить институт замены ненадлежащей стороны (с. 25). Такое утверждение, на наш взгляд, не оправдано с теоретической точки зрения, а также не соответствует арбитражной практике.

Спорным является вывод о нецелесообразности введения в действующее гражданское процессуальное законодательство положения о том, что «стороны обязаны взаимно проявлять уважение к правам и законным интересам другой стороны» (с. 19). Можно только сожалеть, что автор книги, рассматривая спорные вопросы участия прокурора в гражданском процессе, обошел вниманием приказ Генерального прокурора СССР № 71 от 29 сентября 1987 года «О коренной перестройке работы органов прокуратуры по осуществлению прокурорского надзора за исполнением законов в гражданском судопроизводстве».

Эти и некоторые другие замечания носят в большей степени дискуссионный характер и не влияют на общую положительную оценку рецензируемой работы в целом. Монография В. Н. Гапеева вносит полезный вклад в развитие теории гражданского и арбитражного процесса.

**В. Г. Тихиня**